НавінЫ
БНФ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
нумар 18 (51) 22 чэрвеня 2001 г.

## Ініцыятыўныя групы зарэгістраваныя

*15 чэрвеня а 18 гадзіне скончыўся тэрмін падачы ў Цэнтарвыбаркам сьпісаў ініцыятыўных групаў па вылучэньні кандыдатаў у прэзыдэнты.*

Як паведаміў БелаПАНу сакратар Цэнтарвыбаркаму Мікалай Лазавік, у барацьбу за прэзыдэнцкае "крэсла" пажадалі ўступіць 25 прэтэндэнтаў: дырэктар Міжнароднага інстытуту мэнэджмэнту, дэпутат Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня Віктар Цярэшчанка (у ягонай ініцыятыўнай групе – 6069 чалавек); лідэр Лібэральна-дэмакратычнай партыі і блёку "Новая Беларусь – Адзінства" Сяргей Гайдукевіч (2136); былы міністар абароны Беларусі Павал Казлоўскі (1609); віцэ-прэзыдэнт міжнароднай асацыяцыі "Абарона правоў чалавека" Мікалай Мякека (135); лідэр Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін (2076); дзейны прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка (3830); лідэр Кансэрватыўна-Хрысьціянскай

*Працяг на стар 2.*

## Нечарговы Зьезд Партыі БНФ унёс зьмены ў Статут арганізацыі

Нечарговы Зьезд Партыі БНФ, які адбыўся 16 чэрвеня, меў, фактычна, адну задачу: дэлегаты сабраліся, каб тэрмінова скарэктаваць тыя палажэньні Статуту Партыі БНФ, якія да гэтага часу значна абцяжарвалі працу рэгіянальных структураў. Адпаведныя зьмены ў Статут былі падрыхтаваныя загадзя й прынятыя на Зьезьдзе.

На Зьезьдзе прагучала таксама інфармацыя пра актуальную палітычную сытуацыю. Яшчэ раз была пацьверджаная воля БНФ вызначыцца з адзіным кандыдатам, падтрыманым дэмакратычнымі сіламі, да моманту рэгістрацыі па выніках збору подпісаў.

**Андрэй УРБАНОВІЧ**

# Падумаем разам!



**Юры ХАДЫКА**

*Афіцыйны пачатак выбарчай кампаніі ўжо абвешчаны. Чым бліжэй гэты дзень, тым важнейшым становіцца дасягненьне адзінства усіх здаровых сілаў беларускага грамадзтва як паводле стратэгічных, так і паводле тактычных аспэктах падчас прэзыдэнцкіх выбараў. Самы час, вобразна кажучы, зьверыць гадзіньнікі.*

Перадусім неабходна канстатаваць агульную згоду усіх магчымых і немагчымых кандыдатаў наконт непазьбежнасьці зьмены цяперашняга прэзыдэнта. У гэтым праяўляецца сусьветна-гістарычная адзінота дыктатараў. Акрамя сябе Аляксандру Рыгоравічу няма чаго й няма каго прапанаваць Беларусі.

Аднак ліквідаваць дыктатара яшчэ ня значыць ліквідаваць створаны ім рэжым. У гэтай супярэчнасьці й зьмяшчаецца першы крытэр адзнакі й адбору дэмакратычных кандыдатаў на першую дзяржаўную пасаду. Асалоду дыктату Беларусь пасмакавала дастаткова. Таму на грамадзкую падтрымку мае права разьлічваць толькі той кандыдат, хто гатовы вярнуць дзяржаву ў прававое поле. Зь незалежнымі галінамі ўлады – выканаўчай, заканадаўчай і судовай. Інакш кажучы, той, хто гатовы ажыцьцявіць канстытуцыйную рэформу, выкарыстоўваючы "царскія паўнамоцтвы", якія дае прэзыдэнту сёньняшняя Канстытуцыя.

Калі прэтэндэнт не заяўляе аб такой гатоўнасьці, то падтрымліваць яго падчас выбарчай кампаніі нельга. Бо гэта будзе другі Лукашэнка, якое б у яго прозьвішча не было. Праўда й посьпех такога "квазі-Лукашэнкі" ў барацьбе з аўтарам і творцам дыктатарскага рэжыму малаверагодны. Калі толькі А. Р. у запалохваньні сваёй вэртыкалі не перагне палку. І ня створыць сытуацыю 1994 г., калі фаварыт выбарчай кампаніі быў кінуты ня толькі шырокімі пластамі электарату, але й сваім атачэньнем.

Безумоўна, у Беларусі ёсьць сілы, за-

*Працяг на стар 4.*

vytoki.net

# Ці дапамогуць журналісты?

*Міжпартыйны цэнтар па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў заклікае незалежных журналістаў дапамагчы недапусьціць масавых фальсыфікацыяў пад час выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь*

15 чэрвеня ў Менску Міжпартыйны цэнтар па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў, у які ўваходзіць большасьць ад зарэгістраваных у Міністэрстве юстыцыі палітычных партыяў зладзіў прэсавую канфэрэнцыю, у якой бралі ўдзел Вячаслаў Сіўчык (каардынатар Міжпартыйнага цэнтру), Валеры Ржаньнікаў (БСДП (НГ)), Натальля Хрусталёва (Партыя жанчынаў "Надзея"), Аляксандар Цынкевіч (АГП).

Удзельнікі прэсавай канфэрэнцыі распавялі пра шматлікія парушэньні законаў супрацоўнікамі выканкамаў. Паводле зьвестак Міжпартыйнага цэнтру гэта: непрыняцьце пратаколаў, рэгістрацыя пратаколаў не пад першымі нумарамі, адміністрацыйны ціск, пераслед з боку МУС і КДБ. Былі агучаныя заявы палітычных партыяў пра парушэньні законаў з боку выканаўчай улады (Менская вобласьць – Жодзіна, Стаўбцоўскі, Капыльскі раёны; Гарадзенская вобласьць – Сьвіслацкі, Навагрудзкі, Ашмянскі, Карэліцкі раёны; Віцебская вобласьць – Шаркаўшчынскі, Браслаўскі, Аршанскі раёны; Гомельская вобласьць – Лельчыцы; Магілеўская вобласьць – Слаўгарад, Глускі, Магілеўскі, Бабруйскі, Кіраўскі раёны).

Аднак не зважаючы на цяжкасьці, упершыню партыямі вылучаны прадстаўнікі па ўсіх тэрытарыяльных камісіях. Гэта 600 чалавек (усяго тэрытарыяльных камісіяў 166). Як адзначыў Вячаслаў Сіўчык, "мы стварылі рэальную сыстэму перашкоду фальсыфікацыям".

У апошні дзень вылучэньня прадстаўнікоў у тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі ўдзельнікі прэсавай канфэрэнцыі зрабілі выснову, што праўдзеньне прэзыдэнцкіх выбараў пад пагрозай, бо рэжым незаконна сфармаваў усю сыстэму выбарчых камісіяў. Актывісты партыяў амаль нідзе не зафіксавалі сходы, паводле якіх улады пішуць пратаколы. Паводле словаў Валерыя Ржаньнікава, "у камісіях паслухмяныя людзі, якія выканаюць усё, што ім скажуць, намалююць патрэбныя працэнты". Але ўсе пагадзіліся, што мірыцца з лукашэнкаўскімі сьпісамі нельга.

**Аксана АНАСКА**

*ЗАЯВА*

# У сувязі з парушэньнямі падчас фармаваньня выбарчых камісіяў

З трывогай намі было ўспрынятае паведамленьне Міжпартыйнага цэнтру па вылучэньні прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў. Паводле яговых зьвестак, у шэрагу раёнаў краіны аказваецца проціідзеяньне рэгістрацыі пратаколаў аб вылучэньні кандыдатаў у сябры тэрытарыяльных камісіяў і непасрэднаму ўключэньню грамадзянаў у іхны склад. Такія факты былі выяўленыя ў Стаўбцоўскім, Капыльскім, Сьвіслацкім, Навагрудзкім, Ашмянскім, Карэліцкім, Шаркаўшчынскім, Браслаўскім, Аршанскім, Лельчыцкім, Слаўгарадзкім, Глускім, Магілеўскім, Бабруйскім, Кіраўскім і некаторых іншых раёнах. Прадстаўнікі вэртыкалі выкарыстоўваюць забароненыя прыёмы запалохваньня й прамога ціску на людзей, якія паставілі подпісы ў падтрымку вылучэньня тых ці іншых асобаў. Па кожным факце заявы падаюцца ў Цэнтравыбаркам. Але Цэнтральная камісія ігнарue іх і не сьпяшаецца рэагаваць адпаведным чынам. Гэта дае нам падставы меркаваць аб арганізаваных і скаардынаваных дзеяньнях выканаўчай улады, накіраваных на недапушчэньне грамадзкага кантролю за працай выбарчых камісіяў.

18 чэрвеня пачалося непасрэднае фармаваньне тэрытарыяльных камісіяў. Высьветлілася, што й на гэтым этапе мясцовыя ўлады імкнуцца выключыць любую прысутнасьць прадстаўнікоў дэмакратычных партыяў у складзе камісіяў. Гэта выклікае ў нас сур'ёзную занепакоенасьць, паколькі падобны падыход не адпавядае прынцыпам дэмакратычнага фармаваньня выбарчых камісіяў і ставіць пад падгрозу аб'ектыўнасьць, публічнасьць і справядлівасьць іхнай будучай дзейнасьці, а таксама параджае сумненьні ў празрыстасьці ўсёй выбарчай кампаніі.

У сувязі зь пералічанымі фактамі мы зьвяртаемся да Цэнтральнай камісіі па выбарах, да кіраўніцтва мясцовых выканаўчых камітэтаў і прэзыдыюмаў Саветаў дэпутатаў з патрабаваньнямі непахіснага выкананьня беларускага заканадаўства й захаваньня правоў чалавека.

Неўзабаве пачнецца вылучэньне прадстаўнікоў грамадзкасьці ў склад участковых камісіяў. Мы патрабуем, каб практыка фармаваньня камісіяў за "зачыненымі дзьвярыма" была спыненая, каб публічныя заявы выканаўчай улады аб дэмакратычнасьці выбарчага працэсу не разыходзіліся са справай.

**Ініцыятыўная група Сямёна Домаша**

**19 чэрвеня 2001 году**

Пачатак на стар. 1

## Ініцыятыўныя групы зарэгістраваныя

партыі – БНФ Зянон Пазьняк (1429); лідэр арганізацыі "Рэгіянальная Беларусь" Сямён Домаш (3756); дырэктар ТАА "Ліпень" Аляксей Ляшко (392); былы віцэ-прэм'ер ураду Леанід Сініцын (1976); лідэр Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларускай Уладзімер Ганчарык (4067); лідэр арганізацыі "Рабочая самадапамога" Сяргей Антончык (1 160); Надзвычайны і Паўнамоцны Амбасадар Беларусі ў Латвіі, па сумяшчальніцтве ў Эстоніі й Фінляндыі Міхаіл Марыніч (811); старшыня рэспубліканскага камітэту Беларускага прафсаюзу працаўнікоў аграпрамысловага комплексу Аляксандар Ярашук (1210); інжынэр электроннай тэхнікі, юрыст, часова не працуючы Канстанцін Кананговіч (142); генэральны дырэктар ЗАТ "Атлянт" Леанід Калугін (120); прадпрымальнік, афіцэр запасу КДБ Валянцін Сямак (300); дэпутатка Палаты прадстаўнікоў, дачка былога першага сакратара ЦК КПБ Пятра Машэрава Натальля Машэрава (1282); былы віцэ-прэм'ер Беларусі Міхаіл Чыгір (1485); загадчыца філіі, бібліятэкарка БДЭУ Ніна Лабанава (364); старшыня стачкаму прадпрымальнікаў Валеры Леванеўскі (354); галоўны рэжысэр тэатру сатыры й гумару "Хрыстафор" Яўген Крыжаноўскі (135); дэпутат Мінгарсавету, прадпрымальнік Юры Даньков (244); дэпутат Палаты прадстаўнікоў, кіраўнік ЗАТ "Гандлёвы Дом БелБабаеўскае" Сяргей Скрабец (170); пэнсіянэр Уладзімер Лапцэвіч (212).

Цэнтравыбаркам зарэгістраваў 22 ініцыятыўныя групы па вылучэньні кандыдатамі на пост прэзыдэнта, адсеяўшы за розныя парушэньні А. Ляшка, Н. Лабанаву, Ул. Лапцэвіча й 26-га прэтэндэнта, які падаў заяву па электроннай пошце па сканчэньні тэрміну, у панядзелак, 21 чэрвеня, бізнэсоўца Аляксандра Батуру.



vytoki.net

# За налепку — высяленьне зь інтэрнату

*Вучань Ліцэю БДУ, пераможца Рэспубліканскай Алімпіяды па гісторыі, Машкоў Дзьмітры 12 чэрвеня быў выселены зь інтэрнату.*

Суседу Машкова, Сержуку Васільеву, пагражаюць тым жа. Падставай для такіх дзеяньняў адміністрацыі ліцэю стала налепка "Чарнобыльскі шлях", прымацаваная на дзьвярах пакою Дзьмітрыя. Абодва хлопцы зьяўляюцца інтэлектуальным гонарам ліцэю: яны ўдзельнічалі ў шматлікіх міжнародных канфэрэнцыях, атрымалі дыплёмы пераможцаў Рэспубліканскай алімпіяды па гісторыі 2000-2001 г.г. і маюць сэртыфікаты Ды-джэяў Адраджэньня. На словы хлопцаў аб тым, што іх палітычныя погляды зьяўляюцца асабістай справай, завуч ліцэю адказала абяцаньнем выклікаць у інтэрнат міліцыю.

Неаднаразовы ўдзел Зьміцера і Сержука ў апазыцыйных акцыях даўно выклікаў пільную ўвагу адміністрацыі Ліцэю. Ня маючы сьмеласьці адкрыта выключыць хлоцаў-выдатнікаў зь ліцэю, мясцовыя начальнікі робяць усё, каб стварыць ім невыносныя ўмовы навучаньня.

Малады Фронт заяўляе, што адказам на перасьлед нацыянальна сьвядомай і грамадзка актыўнай моладзі стане ўзмацненьне руху супраціву на ўсіх франтах барацьбы з рэжымам.

## У Дзень мэдыка Малады Фронт правёў акцыю «Не згубі свой голас!»

*У нядзелю, 17 чэрвеня, у Дзень мэдыка Малады Фронт правёў у Менску акцыю "Не згубі свой голас!"*

Апоўдні некалькі маладафронтаўцаў, апранутыя у белыя халаты, выйшлі да Камароўскага рынку, і рухаючыся паўз плынь людзей да станцi мэтро "Плошча Якуба Коласа" і філярмоніі, пачалі раздаваць адмысловыя мэдычныя памяткі:

Міністэрства аховы здаровай улады паведамляе:

Грамадзяне Беларусі! У летні пэрыяд, уключна да пачатку восені, будзе праводзіцца прафіляктычная кампанія, скіраваная на папярэджаньне фактаў губляньня голасу людзьмі. У межах кампаніі будзе праводзіцца масавае азнаямленьне насельніцтва зь інфармацыяй, якая дапаможа не згубіць голас.

Статыстыка сьведчыць: апошнія гады ў Беларусі назіраюцца выпадкі масавага губляньня галасоў насельніцтвам. Апошнія эпідэміі прыпадалі на травень 1995 г., лістапад 1996 г.

ГАЛАСУЙЦЕ НА ВЫБАРАХ 9.09.2001г.!

Лор "Малады Фронт" вядзе прыём кожны чацьвер а 19.00 па адрасе: вул. Варвашэні, 8. Тэл. для запісу: 284-50-12.

Рэцэпты ад лора-Малады Фронт карысталіся вялікім попытам. Людзі сьмяяліся, запытвалі, за каго аддаць свой голас і зычылі посьпеху Маладому Фронту.

Затрыманьняў не было: міліцэйскія патрулі, пакліканыя сачыць за грамадзкім парадкам, акурат у гэты час былі занятыя разгонам бабулек-гандлярак.

09.09.2001

**ЗРАБІ**

**МАЛАДЫ ФРОНТ**

**ПРЭЗЫДЭНТА!**

# Маладафронтаўцу пагражаюць вопісам маёмасьці

*За расклейваньне ўлётак яшчэ на пачатку лютага ў Менску быў затрыманы маладафронтавец Міхась Чыжык. Хлопца выклікалі на камісію па справах няпоўнагадовых Фрунзэнскага раёну сталіцы, куды аднак, ён не зьявіўся. У адсутнасьці Міхася яму быў выпісаны штраф памерам 1 мінімальны заробак.*

Але пакольки Міхась ёсьць няпоўнагадовым, штраф мусілі выпісаць на бацькоў. Тым ня менш у красавіку поштай маладафронтаўцу прыйшло папярэджаньне: калі не аплаціце штраф – будзе суд. Штраф, зразумела, ніхто не плаціў. Паводле словаў Міхася, міліцыянты пры афармленьні пратаколу пераблыталі блянкі, узяўшы блянкі паўнагадовых, у якіх, сярод іншых, ёсьць пункт "месца працы". Міліцыянты напісалі, што Міхась "працуе" вучнем у СШ № 116.

Днямі па пошце М. Чыжыку прыйшла позва (хоць у ёй самой пазначана, што яна павінна ўручацца асабіста), у якой гаворыцца, што ў выпадку няяўкі ў суд хлопца наведае ўчастковы міліцыянт, а за нявыплату штрафу пагражае вопіс маёмасьці.

Цяпер Міхась чакае, што будзе далей і рыхтуе да вопісу свае школьныя рэчы.

**Матэрыялы падрыхтавала пресавая служба Маладога Фронту**



vytoki.net

# Падумаем разам!

Пачатак на стар. 1

цікаўленыя ў паўтарэньні сытуацыі 1994 г. Тады С. Шушкевіч і З Пазьняк, ня здолеўшы дамовіцца, раскалолі дэмакратычны электарат і прывялі да ўлады А.Лукашэнку, пазбавіўшы выбару у другім туры прагрэсіўную частку грамадзтва. Ёсьць людзі, якія хочуць дыктатуры з "чалавечым тварам". Яны думаюць, што занапад эканомікі, міжнародная ізаляцыя – гэта наступствы асабістых якасьцяў А. Р., а не рэжыму адзінаасобнай улады. Яны будуць імкнуцца да таго, каб дэмакратычныя лідэры паўтарылі памылку 1994 году. Будуць дзеля гэтага распальваць асабістыя амбіцыі, распаўсюджваць плёткі й дэскрыдытаваць кожнага дэмакратычнага кандыдата і іх усіх разам.

Адзіны спосаб супрацьстаяць гэтай гнюснай тактыцы – гэта мець аднаго дэмакратычнага кандыдата.

Здаецца, з гэтым згодныя ўсе. Здаецца, усе разумеюць, што два, а тым больш пяць дэмакратычных кандыдатаў, – гэта ня толькі перамога А. Лукашэнкі. Гэта ягоны трыюмф. Ён пераможа разьяднаныя дэмакратычныя сілы й будзе прызнаны заходнімі дэмакратыямі як законны галава Беларусі. Нават у тым выпадку, калі ягоная перамога стане вынікам фальсыфікацыі вынікаў галасаваньня і грубых парушэньняў заканадаўства. Ніхто ня зможа даказаць недэмакратычны характар выбараў, нават калі ў іх будзе браць удзел некалькі дэмакратычных кандыдатаў. Такая сытуацыя вельмі выгодная для А. Лукашэнкі. І невыгодная для Беларусі. Калі патаемна не жадаць ягонага вар'яцкага кіраваньня яшчэ на пяць год.

Удумлівы чытач можа мне запярэчыць: як нам абраць гэтага адзінага дэмакратычнага кандыдата? Ужо сёньня мы маем пяць вядомых прэтэндэнтаў. Ды яшчэ З. Пазьняк, С. Гайдукевіч. Ды яшчэ Л. Сініцын і Н. Машэрава. Важнае пытаньне. Пытаньне палітычнай тактыкі і палітычнай культуры.



Павал Казлоўскі (зьлева)

Скажам адразу, што дэмакратычным кандыдатам можа лічыцца толькі той, хто падтрымліваецца аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі. Гэта значыць партыямі й арганізацыямі, якія сваімі дзеяньнямі, сваім супрацьстаяньнем з рэпрэсіўным дыктатарскім рэжымам набылі права называцца дэмакратычнымі. З гэтага пункту гледжаньня ні Л. Сініцын, ні С. Гайдукевіч, ні Н. Машэрава, ні С. Калякін ня могуць лічыцца дэмакратычнымі кандыдатамі, нават у выпадку іхнага ўдзелу ў выбарчай кампаніі, бо яны нічым свайго дэмакратызму не засьведчылі. З. Пазьняк сам выступае супраць аб'яднаньня дэмакратычных сілаў і падтрыманы імі быць ня можа. Нескаардынаваны, няўзгоднены ягоны ўдзел у выбарчай кампаніі 2001 году будзе горшы, чым памылка 1994 году.



Мікалай Чаргінец, кіраўнік ініцыятыўнай групы збору подпісаў А. Лукашэнкі, і Сяргей Калякін

Усё гэта – пытаньні палітычнай культуры. Ня могуць называцца дэмакратычнымі партыі, якія ва ўмовах барацьбы з дыктатурай так ці інакш выступаюць на баку гэтай дыктатуры.

Такім чынам, рэальна мы маем чатырох прэтэндэнтаў на пачэсную і адказную пасаду адзінага дэмакратычнага кандыдата на маючых адбыцца прэзыдэнцкіх выбарах. Кожны зь іх мае свае заслугі перад Бедарусьсю і дэмакратыяй. Кожны зь іх у стане перамачы А. Лукашэнку. Але ня ўсе разам. У гэтым парадокс сытуацыі, якая склалася. Здаецца, калі б зараз прагучаў заклік да Ул. Ганчарыка, С. Домаша, П. Казлоўскага й М. Чыгіра ахвяраваць жыцьцём дзеля Беларусі, альбо адмовіцца ад прэзыдэнцкіх амбіцыяў, то кожны зь іх хутчэй выбера першае, чым другое.

Пра гэтую тупіковую сытуацыю кажа досьвед шматмесячных перамоваў паміж прэтэндэнтамі, што арганізаваныя Каардынацыйнай Радай дэмакратычных сілаў. КРДС праявіла максымум цярплівасьці, талерантнасьці й далікатнасьці, даючы самім прэтэндэнтам магчымасьць арганізаваць каманду, а ня ладзіць тусоўку, спрабуючы адначасова прасунуцца ў адны дзьверы. Таму набліжаецца момант, калі Рада сама будзе вымушаная зрабіць выбар.

КРДС – адзіны рэальны блёк дэмакратычных партыяў і няўрадавых арганізацыяў, здольны бяз грошай прыцягнуць да выбарчай кампаніі дзясяткі тысячаў актывістаў. Чуткі аб тым, што КРДС перастала існаваць, альбо моцна саслабела ў выніку выйсьця зь ейнага складу Статкевіча зь ягонымі прыхільнікамі ці Партыі працы А. Бухвостава вельмі перабольшаныя. Натуральна, відавочнае імкненьне на базе прафактыву стварыць "левы цэнтар" – ад С. Калякіна да Ўл. Ганчарыка. Але левацэнтрысцкая пазыцыя ў прасторы палітычнай ідэалёгіі ўжо занятая А. Лукашэнкам. Якія перамены можа абяцаць новы "левы цэнтар" у параўнаньні са старым?

Без левацэнтрысцкіх партыяў КРДС сапраўды ператворыцца ў правацэнтрысцкі блёк. Гэта добра й блага адначасова. Добра таму, што праграма таго кандыдата, які будзе абапірацца на падтрымку КРДС, стане больш зразумелай, дакладнай і адрознай ад праграмы А. Лукашэнкі. Але блага таму, што кансалідацыя двух цэнтраў супрацьстаяньня існуючаму рэжыму якраз вельмі выгодная для А. Лукашэнкі. Бо гэта паўтор сытуацыі 1994 году. І сам дыктатар, ня маючы падтрымкі большасьці

Працяг тэмы на стар. 5

# Падумаем разам!

грамадства, лёгка выйграе такія выбары. Натуральна, што наяўнасьць большай колькасьці кандыдатаў палегчыць задачу ППРБ.

У сытуацыі, калі дэмакратыя змагаецца з дыктатурай, дэмакратычныя сілы ня могуць дазволіць сабе раскошу вылучэньня двух (ці большай колькасьці) кандыдатаў. Таму і ўзьнікае вельмі важнае пытаньне: што ж рабіць, каб не наступаць на адны і тыя ж граблі двойчы?

Паўсталы нядаўна рух "За новую Беларусь", які аб'ядноўвае вялікую колькасьць вядомых і аўтарытэтных асобаў, як быццам бы дае магчымасьць да-



*Натальля Машэрава хоча стаць «першай лэдзі» ў Беларусі*

весьці пяцёрку да адзінкі. Вядома ж, калі ня будзе ігнараваць КРДС. І калі ня спозьніцца. А такая небясьпека існуе.

Цяпер змагаюцца два пункты гледжаньня: абраць адзінага кандыдата дэмакратычных сілаў да пачатку збору подпісаў, ці пасьля працэдуры рэгістрацыі. Маўляў, нехта ня зможа набраць неабходныя сто тысячаў подпісаў. Нехта ня будзе зарэгістраваны, і тады тыя, што застануцца, альбо самастойна, альбо пад ціскам аўтарытэтных людзей назавуць адзінага, які працягне барацьбу, а ўсе астатнія зьнімуць свае кандыдатуры. Сапраўды няма межаў фантазіям! Дарэмна прасіць у прыхільнікаў гэтага варыянту выбарчай тактыкі прывесьці прынамсі адзін прыклад, калі чалавек, які выканаў жорсткія патрабаваньні, што прад'яўляюцца да кандыдатаў, быў зарэгістраваны, а потым зьняў сваю кандыдатуру. Іх проста няма. Таму што гэта ня толькі пытаньне амбіцыяў, але й пытаньне адказнасьці перад тымі, хто падтрымаў вылучэньне і тымі хто даў грошы на перадвыбарную кампанію.

Але такіх пярэчаньняў мала. У нашых умовах амаль поўнага дзяржаўнага кантролю над СМІ проста недапушчальна самім дэмакратычным сілам цэлы месяц, на працягу якога будзе ажыцьцяўляцца збор подпісаў, заблытваць людзей і драбіць уласныя сілы, агітуючы адразу за пяцёх кандыдатаў! Больш за тое, такая тактыка дазваляе ЦВК цалкам кантраляваць хаду выбарчай кампаніі. Яна дазваляе ня толькі адхіліць найбольш цяжкіх праціўнікаў для дыктатара. Але яшчэ горш – пакінуць некалькі "дэмакратычных" кандыдатаў для палягчэньня агульнай перамогі А. Лукашэнкі.

Я не выпадкова ўзяў слова "дэмакратычных" у двукосьсе. Бо такія кандыдаты ня маюць (а больш дакладна, ня будуць мець) ніякага права называцца дэмакратычнымі. Яны будуць проста пасобнікамі агіднага дыктатарскага рэжыму. Яны павінны ведаць гэта ўжо сёньня. Хопіць нам ганьбы 1994 году. Хопіць тых стратаў, якія панесла Беларусь за апошнія сем год.

Такім чынам, у нас застаецца толькі адзін варыянт. Назваць кандыдатуру адзінага дэмакратычнага прэтэндэнта да пачатку збору подпісаў. З тым каб не раздрабіць сілы. З тым каб ня блытаць выбарцаў, а адразу агітаваць за свайго прадстаўніка. З тым каб пазбавіць ЦВК права гуляць з прэтэндэнтамі. Адзінага дэмакратычнага кандыдата Л. Ярмошына ня зможа не зарэгістраваць, і гэта будзе поўны провал для Лукашэнкі. Такія выбары не прызнае ніводная дэмакратычная дзяржава ў сьвеце. А гэта значыць – дыктатар не атрымае матэрыяльнай падтрымкі.




*Сямён Домаш*

Хто назаве гэтую доўгачаканую кандыдатуру, ня мае значэньня. Хай гэта будзе кааліцыйнны рух "За новую Беларусь". Але ў пагадненьні з КРДС. Няхай гэта будзе Кангрэс дэмакратычных сілаў. Але ў пагадненьні з "НБ". Нават лепей, калі гэта будзе Кангрэс дэмакратычных сілаў. У яго працы можа прыняць удзел і рух "За новую



*Уладзімер Ганчарык*

Беларусь". Усе 115 чалавек, што падпісалі зварот да беларускага народу. Але вельмі важна, каб назвалі гэтую кандыдатуру людзі, якія будуць хадзіць па кватэрах падчас выбарчай кампаніі. І людзі, якія потым створаць каманду новага прэзыдэнта.

Гэтыя дзьве катэгорыі людзей нельга супрацьпастаўляць. Такое ў нас палітычнае становішча, што разам з тысячамі шараговых сябраў дэмакратычных партыяў жывуць сотні прадстаўнікоў навукі, культуры, чыноўніцтва, без якіх не абыдзецца новая ўлада. Але якія, як чорт кадзіла, баяцца "нацыяналізму" й "радыкалізму" дэмакратычных партыяў. Прыйшоў час выкінуць гэтыя страшылкі на сьметнік гісторыі. Трэба злучыць гэтыя дзьве антыдыктатарскія плыні ў адзіную, якая й ачысьціць аўгіевыя стайні рэжыму ў верасьні гэтага году.


vytoki.net

# Малады Фронт ідзе ў наступ

ВІЦЕБСК

У пачатку чэрвеня віцебскі Малады Фронт літаральна апанаваў горад. На платах, бэтонных сьценах, будоўлях і асфальце зьявіліся сотні надпісаў "Малады Фронт!", "Горад – наш!" і "Зрабі прэзыдэнта!" На галоўных вуліцах Віцебску – Леніна, Маскоўскім праспэкце, Будаўнікоў, Чкалава, Інтэрнацыяналістаў, Чарняхоўскага, на плошчы Перамогі і ў іншых месцах гораду расклееныя бел-чырвона-белыя ўлёткі "Горад – наш!" Маладафронтаўцы выкарыстоўваюць тактыку "геамэтрычнай прагрэсіі": на кожную сарваную улётку штоночы зьяўляюцца дзьве новыя. Спалоханыя мясцовыя камунальнікі ўжо баяцца зьдзіраць агітацыю. Напярэдадні судовага працэсу над лідэрамі віцебскага Маладога Фронту (за дэманстрацыю ў падтрымку палітвязняў) усё навакольле Кастрычніцкага суду было паказальна расьпісанае і аклеенае бел-чырвона-белым.

Яшчэ большы сюрпрыз чакаў студэнтаў Віцебскага дзяржунівэрсітэту, якія якраз пачалі здаваць іспыты. Спачатку на першым паверсе галоўнага корпусу былі намаляваныя фарбай бела-чырвона-белыя палосы. Калі адміністрацыя распарадзілася зафарбаваць небясьпечную "крамолу", удвая большы сьцяг зьявіўся паміж вокнамі на самым верхнім паверсе. Відавочна, аграмадны малюнак быў зроблены з рызыкай для жыцьця, але й зьнішчыць яго цяпер магчыма толькі з дапамогай акрабатаў альбо альпіністаў. А многія студэнты ВДУ цяпер карыстаюцца адмысловымі асадкамі з надпісам "Выбары - 2001", якія распаўсюджваюць маладафронтаўцы.

БЕРАСЬЦЕ

Яшчэ на пачатку месяца ў кватэры лідэра берасьцейскай арганізацыі Маладога Фронту Сержука Бахуна судовыя выканаўцы зрабілі спробу апісаць ягоную маёмасьць. Прычынай такой санкцыі стала тое, што сп.Бахун не аплаціў штраф памерам у 200 мін. заробкаў. Такое пакараньне было накладзенае на яго судом Ленінскага раёну Берасьця за тое, што 10 сьнежня мінулага году ён распаўсюджваў у родным горадзе тэкст Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека. Лідэр берасьцейскага Маладога Фронту тады не пагадзіўся з высунутым супраць яго абвінавачваньнем у правядзеньні несанкцыянаванага пікету. Далейшыя спробы абскардзіць судовае рашэньне былі беспасьпяховымі.

На спробы апісаць маёмасьць сп. Бахуна ягоная маці паведаміла, што ў хаце няма каштоўных рэчаў, якія належаць асабіста Сержуку. Тады Бахуну прапанавалі напісаць заяву ў абласны суд з просьбай замяніць гэты штраф арыштам. Але Сяржук Бахун сваёй віны не прызнае. Ён мяркуе, што яго спрабуюць запалохаць напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў і сьцьвярджае, што гэтае запалохваньне тычыцца ня толькі яго асабіста, але й бацькоў.

Месяц таму была звольненая з працы маці Сержука. Цяпер адміністрацыя аб'яднаньня "Брэстплодгароднінапрам" ставіць пытаньне аб скасаваньні працоўнага кантракту з бацькам – Пятром Бахуном. Суседзі, сваякі ды калегі па працы ня лічаць усе гэтыя захады выпадковасьцю і зьвязваюць іх выключна з актыўнай дзейнасьцю Сержука Бахуна ў маладзёвым руху супраціву.

Між тым, нягледзячы на рэпрэсіі й перасьлед, берасьцейскі Малады Фронт вядзе на вуліцах актыўную кампанію расклейкі й надпісаў "Горад – наш!" у розных раёнах Берасьця. Сяржук Бахун заявіў, што моладзевы супраціў перад выбарамі будзе толькі мацнець.

МАГІЛЕЎ

Магілеўскі Малады Фронт за апошнія тыдні зрабіўся адной з самых папулярных і паважаных установаў у горадзе. Справа ў тым, што напярэдадні выбараў мадладафронтаўцы разгарнулі шырокія сацыяльныя кампаніі за аднаўленьне патрэбных жыхарам аўтобусных маршрутаў, найхутчэйшы рамонт ліфтаў і падачу гарачай вады. Зборы некалькіх тысячаў подпісаў пад гэтымі патрабаваньнямі забясьпечыў маладафронтаўцам усеагульную павагу й падтрымку: цяпер надпісы "Малады Фронт" на асфальце, прыпынках і платах насельніцтва ўспрымае абсалютна пазытыўна, а саміх актывістаў Маладога Фронту як абаронцаў "простага чалавека".

Больш за тое: у апошні час па абласной (!) тэлевізіі прайшлі тры станоўчыя рэпартажы пра Малады Фронт – і гэта пры тым, што БТ не называе маладафронтаўцаў інакш як "адмарозкамі"!

Заканамерна, што на маладафронтаўскія сходы ў Магілеве штотыдня прыходзяць па 40-50 чалавек. Дарэчы, шматлюднай была і сустрэча мясцовае моладзі зь менскімі лідэрамі кааліцыі "ПЕРАМЕНАЎ!", арганізаваная Маладым Фронтам 8 чэрвеня – і, між іншым, яе таксама здымала абласная тэлевізія. Так што глядзіце тэлевізар.

ВОРША

У Воршы актывісты мясцовага Маладога Фронту на трохдзённым сэмінары, арганізаваным маладзёвым цэнтрам "Контур", сустрэліся з прадстаўнічай дэлегацыяй Маладых шведзкіх хрысьціянскіх дэмакратаў (CDU). У складзе дэлегацыі былі кіраўнік міжнароднае камісіі CDU і яе былы старшыня.

Малады Фронт запрасіў замежных гасьцей прыехаць у верасьні на беларускія прэзыдэнцкія выбары і паўдзельнічаць у назіраньні на выбарчых участках у тых гарадах і мястэчках, дзе ёсьць структуры Маладога Фронту. Швэдзскі бок вельмі зацікавіла такая прапанова. Цяпер мясцовым уладам трэба быць гатовымі да прыезду замежных назіральнікаў 9 верасьня.

МАСТЫ

У Мастах у Дзень абароны навакольнага асяродзьдзя 5 чэрвеня МФ ладзіў акцыю "Зрабі свой лес чыстым!"

Некалькі дзясяткаў маладафронтаўцаў прыбралі сьмецце на набярэжнай Нёмана і ачысьцілі ад бруду лес. Найбліжэйшым часам маладыя людзі зьбіраюцца ўсталяваць у лясной зоне шыльды з надпісам "Паважай свой лес, прыбірай за сабой сьмецце!"

БАРАНАВІЧЫ

11 чэрвеня Баранавіцкі МФ правёў беларускую дыскатэку для ста маладых жыхароў гораду.

НАРАЧ

17 чэрвеня ў курортным мястэчку Нарач на дваццаціпавярховым гатэлі нечакана зьнік чырвона-зялёны сьцяг, а замест яго над дахам залунала бел-чырвона-белае палотнішча. Акрамя таго, на гэтым жа гатэлі зьявілася сэрыя налепак "Рамонт-2001"

Жыхары гатэлю былі ў захапленьні: многія зь іх насамрэч падумалі, што ўлада зьмянілася. Некаторыя, паказваючы на сьцяг, сьцьвярджалі: "Нарэшце! Нашы ў горадзе!"

Маладафронтаўская кампанія "ГОРАД – НАШ!" ужо ахапіла больш за 30 гарадоў Беларусі.

Яе сэнс у тым, што зыход выбараў вырашыцца ў гарадах (там жыве 70% выбарцаў і абсалютная большасьць моладзі), а гарадзкія жыхары выступаюць за незалежную дэмакратычную Беларусь і супраць рэжыму. Надпісы, бел-чырвона-белыя ўлёткі, спэцвыпуск маладафронтаўскага "Весьніка" й адмысловыя акцыі "ГОРАД – НАШ!" зьявіліся напрыканцы траўня – на пачатку чэрвеня таксама і ў Горадні, Бабруйску, Баранавічах, Барысаве, Жодзіне, Рэчыцы, Мазыры, Вялейцы, Лідзе, Маладэчне, Наваполацку, Мастах і г.д.

**Прэсавая служба МФ**

*Працяг. (Пачатак у № 17.)*

# ШТО ДУМАЮЦЬ ЛІДЭРЫ?

Больш за 70% лідэраў і экспэртаў лічаць, што за апошнія некалькі месяцаў у стасунках Расеі й Беларусі адчуваецца пэрыяд пахаладаньня (табл. 5). Інакш кажучы, атрымліваецца, што Крэмль не задаволены А. Лукашэнкам і таму, ня выключана, можа падтрымаць іншага кандыдата. Ужо неаднаразова ўказвалася, што адключэньне трансьляцыі трох расейскіх каналаў 8 і 9 траўня прынесла для беларускіх уладаў вынікі зусім супрацьлеглыя чаканым. Аднолькава крайне нэгатыўна ацэньваюць гэты інцыдэнт апытаныя прадстаўнікі як дзяржаўных, так і недзяржаўных арганізацыяў (табл. 6). Бо з пункту гледжаньня інтарэсаў расейскіх тэлеканалаў, у тым ліку й дзяржаўнага РТР, гэта адназначна несяброўскі крок, які таксама спрыяе пахаладаньню двухбаковых стасункаў.

Калі йдзецца пра передвыбарныя лёзунгі, пад якімі, хутчэй за ўсё, магчымая перамога на выбарах, рэспандэнты ня згадваюць ні інтэграцыю з Расеяй, ні барацьбу з карупцыяй, што былі падмуркам передвыбарнай праграмы А. Лукашэнкі ў 1994 г. (табл. 7). Перавага аддаецца, зноў-такі, лёзунгам эканамічнага характару. Патлумачыць гэта, напэўна, можна тым, што прыхільнасьць выбарца, заклапочанага праблемай элемэнтарнага выжываньня, даволі складана заваяваць тэзамі пра дэмакратызацыю грамадзтва, захаваньне правоў чалавека і падзел улады.

Рэспандэнты цалкам адэкватна ацэньваюць рэальную сытуацыю, якая існуе ў сыстэме дзяржаўнага кіраваньня – каля 90% зь іх пераканаңыя, што сёньня фактычна парлямэнт падпарадкаваны прэзыдэнту (табл. 9). Тым ня менш, значная большасьць апытаных ня лічыць такое становішча нармальным. Амаль 80% мяркуюць, што прэзыдэнт і парлямэнт павінныя быць незалежныя адзін ад аднога (табл. 8). Мяркуючы па ўсім, чатыры гады "кіраванага парлямэнтарызму" й рэклямаванага афіцыйнай прапагандай "супрацоўніцтва

*Працяг на стар 8.*

Табліца 5. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "Ці адчуваеце Вы пахаладаньне ў стасунках Беларусі з Расеяй за апошнія некалькі месяцаў?", %

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Працаўнікі дзяржсэктару | Працаўнікі недзяржсэктару |
|---|---|---|---|
| Так | 71,3 | 67,7 | 73,5 |
| Не | 17,5 | 22,6 | 14,3 |

Табліца 6. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "Як вядома, 8 і 9 траўня 2001 г. трансьляцыя передачаў трох расейскіх тэлеканалаў (ОРТ, РТР і НТВ) на Беларусь была перарваная, і па гэтых каналах паказвалі передачы Беларускага тэлебачаньня. Як Вы гэта ацэньваеце?", %

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Працаўнікі дзяржсэктару | Працаўнікі недзяржсэктару |
|---|---|---|---|
| Станоўча | 3,8 | 3,2 | 4,1 |
| Адмоўна | 87,5 | 90,4 | 85,7 |
| Мне пра гэта нічога не вядома | 5,0 | 3,2 | 6,1 |

Табліца 7. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "Як Вы лічыце, пад якімі лёзунгамі хутчэй за ўсё пераможа кандыдат у прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь на маючых маючых адбыцца выбарах?", % (магчымы больш за адзін адказ)

| Працаўнікі дзяржсэктару | |
|---|---|
| 1. Падвышэньне жыцьцёвага роўню насельніцтва | 45,2 |
| 2. Дэмакратызацыя грамадзтва | 16,1 |
| **Працаўнікі недзяржсэктару** | |
| 1. Падвышэньне жыцьцёвага роўню насельніцтва | 42,9 |
| 2. Дэмакратызацыя грамадзтва | 24,5 |
| 3. Рэфармаваньне эканомікі | 22,4 |

Пачатак на стар 6.

# ШТО ДУМАЮЦЬ ЛІДЭРЫ?

Табліца 8. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "Якімі павінны быць суадносіны паўнамоцтваў прэзыдэнта й парлямэнту?", %

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Працаўнікі дзяржсэктару | Працаўнікі недзяржсэктару |
|---|---|---|---|
| Парлямэнт і прэзыдэнт павінны быць незалежныя адзін ад аднаго | 78,7 | 74,1 | 81,6 |
| Прэзыдэнт павінны быць падпарадкаваны парлямэнту | 13,8 | 12,9 | 14,3 |
| Парлямэнт павінны быць падпарадкаваны прэзыдэнту | 2,5 | 6,5 | – |

Табліца 9. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне "А якія, на Ваш погляд, фактычныя стасункі прэзыдэнта й парлямэнту?", %

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Працаўнікі дзяржсэктару | Працаўнікі недзяржсэктару |
|---|---|---|---|
| Парлямэнт падпарадкаваны прэзыдэнту | 88,7 | 83,8 | 91,9 |
| Прэзыдэнт падпарадкаваны парлямэнту | 2,5 | 3,2 | 2,0 |
| Парлямэнт і прэзыдэнт дзейнічаюць незалежна адзін ад аднаго | 1,3 | – | 2,0 |

й адзінства галінаў улады" не ўвялі ў зман намэнклятуру. Парлямэнт як быў, так і застаецца бясправўным, пазбаўленым міжнароднага прызнаньня, зьяўляючыся своеасаблівай рэгістрацыйнай палатай прэзыдэнцкай праватворчасьці. Парлямэнтарыям, а некаторыя зь іх памятаюць і іншыя часы, калі Вярхоўны Савет быў сапраўдным найвышэйшым заканадаўчым органам краіны, цяперашні стан відавочна недаспадобы.

*(далей будзе)*

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас: 220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8, Управа Сойму Партыі БНФ

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

____________________
(прозьвішча)

____________________
(імя)

____________________
(імя па бацьку)

**які нарадзіўся "___" __________ 19__ г**

**жыве па адрасе:** __________
(індэкс і поўны адрас)

**род заняткаў:** __________

**тэл.** __________

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ "Адраджэньне" падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

__________ (дата)

__________ (подпіс)

НавіНЫ
Б Н Ф "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 18 (51), 22 чэрвеня 2001 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах нутранай дакумэнтацыі

Адрас для ліставаньня: 220005, Менск, а/с 42, тэл/факс 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com

в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч
рэдактар нумару Аляксей Шэін

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net